УДК [242-523.4+572]:316.7Я.П.Тышкевіч

**В. Л. Гуцько,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск*

# ВІЗУАЛЬНАЯ АНТРАПАЛОГІЯ ПРАВАСЛАЎНЫХ ХРАМАЎ У АПІСАННІ Я. П. ТЫШКЕВІЧА

У артыкуле аналізуюцца формы гістарычных згадак аб праваслаўных храмах у працы Я. П. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета» ў параўнанні з іншымі крыніцамі XIX ст. Прыведзена характарыстыка тэкстаў, гістарычных абставін, якія абагульняюць культурнае значэнне праваслаўных храмаў у гарадах, мястэчках і сёлах Барысаўскага павета. Асэнсаванне праваслаўнай традыцыі ў артыкуле адбываецца праз прызму метадаў візуальнай антрапалогіі – навуковай сферы, якая раскрывае абноўлена разуменне мінулых культурных тэкстаў. Адзначаецца спецыфіка візуальнай антрапалогіі ў даследаваннях Валерыя Падарогі, Шарыфа Шукурава. Аўтар артыкула вызначае апісанне праваслаўных храмаў і іх спецыфіку, вылучае розніцу паміж інфармацыяй у рабоце Я. П. Тышкевіча, напісанай у сярэдзіне XIX ст., гістарычнымі палітычнымі мапамі Мінскай губерніі і звесткамі святароў канца XIX ст. у справаздачах, якія знаходзяцца ў межах сучаснай даступнасці.

**Ключавыя словы:** візуальная антрапалогія, рэлігійная культура, праваслаўны храм, Барысаўскі павет, Яўстафій Піевіч Тышкевіч.

**V. Gutsko,**
*Candidate of Cultural Studies, Associate Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution “Belarusian State University of Culture and Arts”, Minsk*

# VISUAL ANTHROPOLOGY OF ORTHODOX CHURCHES IN E. TYSZKIEWICZ`S DESCRIPTION

This article deals with the analysis of the forms of historical references to Orthodox churches in the paper of E. Tyszkiewicz

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"The description of the Barysaŭ county" as compared with other XIX century sources. The characteristic of texts and historical circumstances, summarising the cultural significance of Orthodox churches in towns and villages of Barysaŭ county, is given. The comprehension of the Orthodox tradition in this article occurs through the prism of the methods of visual anthropology. It is a scientific area that reveals the modern understanding of the cultural texts of the past. The specificity of visual anthropology in research of Valery Padaroga, Sharyf Shukurau, is noted. The author of the article identifies the description of Orthodox churches and their specificity, defines the difference between the information given in E. Tyszkiewicz`s paper written in the mid-XIX century, historical and political maps of Minsk province and clergymen`s reports of late XIX century, which are accessible nowadays.

**Key words:** visual anthropology, religious culture, Orthodox church, Barysaŭ county, Eustachy Tyszkiewicz.

Звесткі аб Барысаўскім павеце XIX ст. сталі вядомы з высокай дакладнасцю дзякуючы навуковай працы «Апісанне Барысаўскага павета», створаную арыстакратам Яўстафіем Піевічам Тышкевічам, у спадчыну атрымаўшага значныя тэрыторыі беларускіх, літоўскіх зямель. Твор быў выдадзены ў 1847 г. у Віленскай тыпаграфіі. Інфармацыя аб тагачаснай тэрыторыі Барысаўскага павета карыстаецца і зараз цікавасцю даследчыкаў, паколькі змяшчае шмат важных гістарычных падзей і асоб, якія пражывалі ў гэты час. Сучасны Барысаўскі раён займае, практычна, аднолькавую тэрыторыю, якая ўваходзіла ў склад павета падчас XIX ст. Намі знойдзены альтэрнатыўныя крыніцы апісання праваслаўных храмаў, іх гісторыя існавання ў больш позніх крыніцах, таму ёсць магчымасць параўнаць іх і вылучыць падрабязнасці, якія будуць цікавы для сучаснікаў.

Візуальная антрапалогія – галіна гуманітарнай навукі, дзе раскрываюцца асноўныя характарыстыкі даследуемых з'яў і падзей у тэкстах культуры, важных для даследчыкаў, але не заўважаных папярэднікамі падчас апісанняў. Таму неабходнасць разглядаць падзеі метадамі візуальнай антрапалогіі становіцца актуальнай для сучаснага развіцця айчыннай культуралогіі. Прадмет даследавання ў візуальнай антрапалогіі ўяўляецца вызначэннем габітуса супольнасці, які непасрэдным чынам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уплывае на аб'екты культуры, у нашым выпадку – храмы праваслаўнай веры.

Вясковая праваслаўная прыходская царква – культурны і рэлігійны цэнтр, дзе святар праводзіць рэлігійныя службы і жыве ў доме побач з царквой разам са сваёй сям'ёй. У царкве адбываюцца асноўныя праваслаўныя царкоўныя службы, прыхаджане абмяркоўваюць са святаром глабальныя падзеі сусветных катаклізмаў. Храмавы святар суправаджае жыццё чалавека як сведка і заступнік перад вышэйшай духоўнай сілай, таму так высока ацэньвалі сяляне паселішчы, дзе існавала прыходская царква (праваслаўны храм са святаром. Царква без прыхода не мела святара), таму што блізкае месцазнаходжанне да царквы лічылася добрым месцам для паселішча. Храм становіцца цэнтрам пакланення продкам і абагульняе мінулае, сучаснае і будучыню супольнасці. Звычайна, рэлігійная забудова фундавалася на месцы язычніцкага капішча, што дае магчымасць сведчыць аб невыпадковасці выбару. Месца забудовы адзначаецца прыроднымі і ландшафтнымі асаблівасцямі – падземныя крыніцы (да прыкладу, святая крыніца ў Свята-Мікалаеўскай царкве Лагойска), азёры, месцы незвычайных падзей (знаходка нерукатворнай іконы каля Жыровіц і пабудова царквы і манастыра каля гэтага месца), невытлумачальныя падзеі, якія суправаджаюць людзей, каля храмаў (так, у вёсцы Лышчы Дабраслаўскага прыхода Мінскай губерніі людзі бачылі стоўп святла над царквой), якія садзейнічаюць урачыстаму ўспрыманню ўсіх падзей, якія адбываюцца ў храме. Святар суправаджае жыццё кожнага прыхаджаніна – правядзенне сямейных абрадаў, да якіх можна аднесці хрышчэнне, вянчанне, пахаванне, а таксама каляндарныя рэлігійныя служэнні – ютраня і вячэрняя служба, святочная і нядзельная літургіі і ўсе абрадавыя дзеянні, дапасаваныя да споведзі і прычашчэння. Акрамя таго, святар мае высокі сацыяльны статус і аўтарытэт сярод жыхароў вёсак прыхода, і сяляне імкнуліся весці сябе суадносна маральным і рэлігійным традыцыям. Роля святара не абмяжоўвалася толькі царкоўнай службай, звычайна яго абавязкамі былі арганізацыя і дзейнасць царкоўна-прыходскай пачатковай школы ці народнай вучэльні для дзяцей прыхаджан, што надавала высокі сацыяльны статус вёсцы і яе ваколіцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усе пералічаныя азначэнні (эстэтыка месца, увацаркаўленне сялян, аўтарытэт святара, арганізацыя навучання) толькі садзейнічалі замацаванню сацыяльнага інстытута царквы ў супольнасці вёскі, падкрэслівая высокую годнасць жыхароў, іх маральныя якасці, якія фарміравалі габітус – агульныя традыцыі, якія не фарміруюць аднолькавае стаўленне да падзей і паўсядзённасці, а, наадварот, становяцца магчымасцю кожнаму з супольнасці быць разнастайным. Разуменне габітуса вызначаецца фенатыпам (знешнім выглядам сялян і прыхаджан праваслаўнай царквы), звычкамі, якімі карысталіся сяляне ў паўсядзённым жыцці, і знакавасцю месца паселішча (наблізканасцю да царквы ці яе аддаленнем). Не выпадкова ў тэксце «Апісанне Барысаўскага павета» Яўстафій Тышкевіч падрабязна апісвае храмы і іх фундатараў, дзе асаблівую ўвагу надае сваім продкам, падкрэслівая знакавасць яго арыстакратычнага роду і сувязь яго з рэлігійнымі храмамі, тым самым сцвярджая сацыяльны статус уладара і мецэната. Хто фундуе храмы, той стварае навакольнае асяроддзе.

Вылучым аўтараў, якія разглядаюць кантэкст візуальнай антрапалогіі ў расійскай навуковай думцы: Валерый Падарога [3], Кацярына Трушкіна [6], Шарыф Шукураў [10] і інш. Асноўны кантэкст даследавання Ш. Шукурава сканцэнтраваўся на пошуку асновы разглядаемых адрозненняў замежнай і расійскай візуальнай антрапалогіі. У замежнай візуальнай антрапалогіі Ш. Шукураў адзначае асобую сканцэнтраванасць на аналізе мастацтва і архітэктуры, у той час расійская візуальная антрапалогія сканцэнтравана на вызначэнні постфальклорных традыцый і іх рэалізацыі ў сучаснай культуры. Даследчык зацікаўлены вызначэннем візуальнай антрапалогіі мусульманскай традыцыі ў сучасным грамадстве, праводзячы сінтэз замежнай і расійскай традыцыі ў метадалогіі. На погляд Ш. Шукурава, у рэлігійным храме адбываецца візуальны і сенсарны кантакт, які далучае чалавека (наведвальніка) да высокай духоўнай ісціны і рэлігійнай спадчыны, увацаркаўлення, звязанага найбольш з візуальным тэкстам – выявамі і архітэктурай храма. Важнай часткай з’яўляецца «выява (арабеска, мазаіка, мікрамалюнкі з выявамі людзей)» [10], якая далучае веруючага да больш цеснага разумення духоўных каштоўнасцей, чым аскетычнае чытанне тэксту Святога Пісання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследаваннямі праваслаўнай культуры Барысаўскага павета XIX ст. займаліся беларускія даследчыкі Л. К. Кухто [2], В. Сосна [5], А. Г. Цымбал [9] і інш. Для іх прац характэрны дакладныя факты аб дзейнасці праваслаўнай канфесіі на тэрыторыі Мінскай губерніі і Барысаўскага павета.

Метады візуальнай антрапалогіі, выкарыстаныя аўтарам падчас даследавання: неўключанае назіранне, кантэнт-аналіз тэкстаў-апісанняў праваслаўных храмаў на тэрыторыі Барысаўскага павета і іх дзейнасці на выснове агляду гістарычных мап Мінскай губерніі XIX ст.

Барысаўскі павет – «адміністратыўная адзінка ў складзе Мінскага намесніцтва (1795–1796), Мінскай губерніі Расійскай імперыі з 1793 г. па 1924 г. Павет быў створаны пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 г.

Па дадзеных перапісу 1897 г. у павеце пражывала 238,2 тыс. чал. У тым ліку беларусы – 80,9 %; яўрэі – 11,2 %; палякі – 4,1 %; рускія – 3,1 %. У павятовым горадзе Барысаве пражывала 15 063 чал., у Докшыцах – 3642 чал.

У 1913 г. у павеце было 28 валасцей: Бярозаўская, Бытчанская, Бягомльская, Вяліка-Долецкая, Вяляцічская, Вітунічская, Валасовіцкая, Гайна-Слабадская (цэнтр – с. Слабада), Глівінская, Дзмітравіцкая, Докшыцкая, Зачысцкая, Зэмбінская, Кішчына-Слабадская, Красналупская, Лагойская, Лашніцкая, Мільчанская, Мсціжская (цэнтр – в. Валокі), Асаўская, Плешчаніцкая, Прусевіцкая, Смалевіцкая, Тумілавіцкая, Ухвальская, Халапеніцкая, Эсьманская, Юр’еўская» [1].

Амаль усе пералічаныя цэнтры валасцей Барысаўскага павета мелі свае праваслаўныя драўляныя храмы і лічыліся прыходскімі цэрквамі, дзе служыў святар.

На мапе 1796 г. адзначаны некалькі населеных пунктаў Барысаўскага павета, якія пералічваюцца і ў тэксце Я. П. Тышкевіча: Лагойск (пяць цэркваў), Мсціж (драўляная царква), Докшыцы (драўляная царква), Тумілавічы (драўляная царква), Асавы (драўляная царква), Смалявічы (драўляная царква), Зэмбін (драўляная царква), Гаенская Слабада (драўляная царква), Барысаў (драўляная царква). Частка населеных пунктаў, якія апісвае ў сваёй працы Яўстафій Тышкевіч, не ўказана на мапах XIX ст., што можна лічыць каштоўным матэрыялам для далейшых даследаванняў у пошуку прычын, чаму цэрквы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

населеныя пункты зніклі ці не ўказаны на картах. Да такіх населеных пунктаў адносяцца Камень, Карсаковічы, Грыцковічы, Небышын, Камяі, Забашэвічы.

Важна адзначыць, што для Яўстафія Піевіча Тышкевіча Жодзін (ці Жодзіна) адзначаны на мапе 1800 г. на мяжы з Ігуменскім паветам, а Янушкавічы адзначаны на памежжы Вілейскага павета.

Перш за ўсё неабходна адзначыць, што Я. Тышкевіч значную ўвагу надзяляе храму як месцу сустрэчы чалавека з высокай, сакральнай культурай. Праваслаўныя саборы становяцца месцам, якое пастаянна змяняецца ў карыстанні і ўладанні. Тым самым, храм становіцца месцам сустрэчы традыцыі. Шмат людзей будавалі храмы для замаўлення лепшай долі ў Бога. Нават бацька Яўстафія Пій будуе «царкву ў 1824 годзе» [7, с. 132], як сведчыць сам нашчадак. Праваслаўныя саборы будаваліся большым чынам у сёлах для сялян, таму можна сказаць, што праваслаўныя храмы – гэта сялянскія храмы.

Што ўпамінаецца ў тэкставых апісаннях Тышкевіча? Дата заснавання і першае ўпамінанне, фундатары, дэканструкцыі будынка ці змена ўласніка, уключаючы іншыя рэлігійныя хрысціянскія канфесіі.

У раздзеле «Аб праваслаўных цэрквах» фундаментальнай працы Я. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета» маюцца сведчанні аб дваццаці адным храме Барысаўскага павета. Акрамя таго, прыведзены звесткі і ўпамінанне аб каталіцкіх храмах, але яны больш сціслыя і колькасць каталіцкіх храмаў, апісаная Я. П. Тышкевічам, налічвала толькі дванаццаць каталіцкіх сабораў. Чым можна абгрунтаваць такі значны разрыў. Перш-наперш, мы павінны зразумець, што большасць насельніцтва Барысаўскага павета складалі сяляне (80,9 %). Яны карысталіся падтрымкай праваслаўных храмаў і святароў, таму і праваслаўных цэркваў было значна больш па колькасці. Падругое, шмат цэркваў лічыліся пераходам ад уніяцкай веры да праваслаўнай. Таму праваслаўныя цэрквы засталіся захоўваць супраціўленне каталіцкаму веравызнанню.

Я. П. Тышкевіч падрабязна апісвае будаўніцтва і гісторыю царквы ў Лагойску. Такое падрабязнае сведчанне аб паходжанні царквы сцвярджае, што ён зацікаўлены гісторыяй храмаў грэчаскага абраду. Ён дакладна апісвае, як пераходзіла спад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чына царкоўных зямель і маёмасці ад праваслаўных манахаў да уніятаў (базыліян) і адваротным чынам – да праваслаўнага прыхода.

Толькі ў Лагойску налічвае Тышкевіч пяць праваслаўных храмаў, якія падрабязна апісвае: «Лагойская Богаяўленская замкавая царква, Лагойская царква Прачыстай, Лагойская прыходская царква Святога Мікалая, Лагойская Спаса-Праабражэнская царква, Юр'еўская паўніяцкая Лагойская царква» [7, с. 129–133].

Адзначым, што для Тышкевіча не было значнага адрознення ў праваслаўнай і паўніяцкай традыцыі, таму што сэнс служэння не змяняўся для прыхаджан.

Яўстафій Піевіч Тышкевіч пералічвае і надае гістарычныя звесткі пра іншыя праваслаўныя храмы Барысаўскага павета. Вельмі часта ўпамінаецца гісторыя яго сям'і – арыстакратычнага роду мецэнатаў падчас апісання храма. Шматлікія храмы былі пабудаваны ці адноўлены сіламі продкаў Яўстафія Тышкевіча: Лагойская Богаяўленская замкавая царква і Лагойская прыходская царква Святога Мікалая, Спаса-Праабражэнская царква ў Камені, Косінская царква. Такім чынам, можна сцвярджаць, што праваслаўныя храмы сталі аплотам сакральнай сілы гарманічнага жыцця, неабходнай для паўсядзённай культуры супольнасці.

Асаблівую ўвагу неабходна надаць матэрыялу, з якога будаваліся храмы. Ва ўсіх цэрквах было выкарыстана дрэва – адзін з прыродных і недаўгавечных будаўнічых матэрыялаў. Драўляныя цэрквы будавалі сціпла, эканомна і хутка. Яны патрабуюць з цягам часу замены – на іх месцы павінна быць новая забудова храма ці каменная рэканструкцыя. Освальд Шпенглер у манаграфіі «Заняпад Еўропы» прадстаўляе драўляныя рэлігійныя храмы Старажытнай Індыі як недаўгавечныя і яны атаясамляюцца з протасімвалам самаспалення старажытнаіндыйскай цывілізацыі. Па аналогіі можна вылучыць драўляныя будынкі цэркваў на беларускіх землях, якія гінулі ў выніку пажараў, а ў XX ст. – падчас антырэлігійнай прапаганды.

У 1879 г. у справаздачах праваслаўных святароў упамінаецца частка храмаў, апісаных Я. П. Тышкевічам. Агульная колькасць храмаў пры канцы XIX ст. значна ўзрасла і наблізілася да



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пяцідзесяці шасці праваслаўных храмаў [4]. На дадзены момант дзейнічаюць трынаццаць праваслаўных цэркваў на тэрыторыі Барысаўскага раёна [8].

На аснове прааналізаванага матэрыялу падвядзём сціслыя вынікі даследавання:

– альтэрнатыўныя крыніцы апісання праваслаўных храмаў дадаюць новыя звесткі аб гісторыі паходжання праваслаўных храмаў у параўнанні са звесткамі, прыведзенымі ў працы Я. П. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета». Колькасць праваслаўных храмаў налічвае прыблізна ў 1847 г. дваццаць адну праваслаўную царкву. Праз некалькі дзесяцігоддзяў становішча змяняецца і ў 1879 г. налічваецца, згодна справаздачам, пяцьдзесят шэсць храмаў па ўсёй тэрыторыі Барысаўскага павета;

– метады візуальнай антрапалогіі звязаны з абноўленым кантэкстам гістарычных тэкстаў культуры, якія вызначаюць новы кірунак у разуменні і тлумачэнні. У справаздачах святароў 1879 г. адзначаецца важнасць умоў правядзення рэлігійнай службы, дзе адзін з галоўных акцэнтаў – царкоўнае начынне і царкоўнае адзенне святароў. Асобая ўвага надзяляецца рамонту і ўзнаўленню будынкаў храмаў. У адрозненне з азначанымі абставінамі апісанне храмаў Я. П. Тышкевіча накіравана на іншыя мэты. Для яго ўяўляецца каштоўным гісторыя заснавання царквы, імя яе фундатара, пытанні ўладарання землямі і канфесіянальныя спрэчкі за ўладу над паствай. Тым самым падкрэсліваецца глабальнасць яго мыслення і ігнараванне візуальных аздабленняў, звязаных з паўсядзённымі клопатамі святароў.

Па заканчэнні неабходна ўзгадаць прыродную адукаванасць і шырокія веды Яўстафія Піевіча Тышкевіча, які стварыў маштабную працу «Апісанне Барысаўскага павета», прысвечаную разнастайным галінам культуры, і выявіў глыбінныя кантэксты, якія і зараз сучасныя даследчыкі могуць аднаўляць на аснове метадаў візуальнай антрапалогіі.

*1.* Борисовский уезд (Минская губерния) [Электронный ресурс] / Коллекция метрических книг, ревизских сказок и исповедных ведомостей. – Режим доступа: https://nashipredki.com/russian-empire/minskaya-guberniya/borisovskiy-uezd. – Дата доступа: 10.06.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Кухто, Л. К.* Отражение конфессиональной ситуации в книге Е. П. Тышкевича «Описание Борисовского уезда» / Л. К. Кухто // Гісторыка-культурная спадчына Барысаўскага рэгіёна паводле працы Я. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета» : Сёмыя Тышкевіцкія чытанні, Барысаў, 15 мая 2018 г. : зб. арт. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Барыс. райвыканкам ; рэдкал. : А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2020. – С. 42–49.

3. Мастерская визуальной антропологии (Руководитель мастерской В. А. Подорога) [Электронный ресурс]. – М. : Худож. журнал, 2000. – 246 с. – Режим доступа: https://garagemca.org/programs/library/catalogue/L3270. – Дата доступа: 17.05.2022.

4. Описание церквей и приходов Минской епархии : составлено по официально затребованным от причтов сведениям [Электронный ресурс]. – Ч. II : Борисовский уезд. – Минск : Типо-литография Б. И. Соломона, 1879. – Режим доступа: https://pravoslavnoe-duhovenstvo.ru/media/priestdb/materialattachment/attachment/f4/9c/f49cea36-33c7-4dda-ad3f-3a0e8485ff48.pdf. – Дата доступа: 12.05.2022.

5. *Сосно, В.* Культурная жизнь белорусских крестьян и деятельность братьев Тышкевичей. The Cultural Life of Belarusian Peasants and the Activity of the Brothers Tyszkiewicz [Электронный ресурс] // Eustachijus Tiškevičius : darbai ir kontekstai. Mokslostraipsniųrinkinys. – Vilnius : Lietuvos Nacionalinis Muziejus. 2014. – С. 157–165. – Режим доступа: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/141882/1/Sosno_VA.pdf. – Дата доступа: 14.05.2022.

6. *Трушкина, Е. Ю.* Визуальная антропология : границы и перспективы [Электронный ресурс] / Е. Ю. Трушкина : автореф. дис… на соиск. канд. наук. – М., 2013. – Режим доступа: https://www.dissercat.com/content/vizualnaya-antropologiya-granitsy-i-perspektivy. – Дата доступа: 12.06.2022.

7. *Тышкевич, Е. П.* Описание Борисовского уезда : пер. с пол. / Е. П. Тышкевич ; под общ. ред. Ж. В. Гилевича, Н. В. Поворотной. – Минск, 2018. – 418 с.

8. Храмы [Электронный ресурс] / Первое Борисовское благочиние. Борисовская епархия. Белорусская Православная Церковь. – Режим доступа: https://www.blagobor.by/hram. – Дата доступа: 13.06.2022.

9. *Цымбал, А. Г.* Праваслаўная царква ў Заходняй Беларусі (1921–1939) / А. Г. Цымбал. – Мінск : МДЛУ, 2016. – 124 с.

10. *Шукуров, Ш.* Визуальная антропология: пространственное видение и методы изображения человека [Электронный ресурс] / Шариф Шукуров // Труды Отделения историко-философских наук РАН – 2006 ; Интелрос. – М. : Наука, 2007. – Режим доступа: http://www.intelros.ru/subject/figures/sharif-shukurov/12757-vizualnaya-antropologiya-prostranstvennoe-videnie-i-metody-izobrazheniya-cheloveka.html. – Дата доступа: 12.05.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ